3. Лутовинова О.В. Лингвокультурологические характеристики виртуального дискурса: монография. – Волгоград: Изд-во ВГПУ «Перемена», 2009. – 477 с.
4. Маслова В.А. Языковая личность витебского студента в зеркале лингвокультурологии // Материалы международного методического семинара «Витебщина и Смоленщина в языковых и культурных контактах: история и современное состояние» (Смоленск, 18 ноября 2010 года). - Смоленск: СмолГУ, 2010. – С. 73–78.

АСАБЛІВАСЦІ ПРОЗВІШЧАЎ ЖЫХАРОЎ АДНАГО З УСХОДНІХ РАЁНАЎ ВІЦЕБШЧЫНЫ

Г.К. Семянькова
Віцебск, УА "ВДУ імя П.М. Машэрава"

Уласнае імя (прозвішча не складае выключэння) з'яўляецца адбіткам асаблівасцей культуры і гісторыі народа, яго светаўспрымання, адносін да ўсяго навакольнага. *Мэта* прапанаванай працы – паказаць, **як** месца пражывання чалавека на тэрыторыі, што мяжуе з Расійскай Федэрацыяй, вызначае характар яго прозвішча. *Актуальнасць* даследавання заключаецца ў выяўленні фактараў, якія ўплываюць на асаблівасці структуры сучасных прозвішчаў.

Матэрыялам паслужыла картатэка прозвішчаў жыхароў Віцебшчыны, створаная шляхам выбаркі з "Пагаспадарчых кніг..." XX ст., тэлефонных даведнікаў, а таксама збору матэрыялу падчас лінгвістычных экспедыцый. *Аб'ектам* аналізу сталі сучасныя прозвішчы жыхароў Лёзненскага раёна.

Для дасягнення пастаўленай мэты выкарыстаны розныя **метады** і прыёмы аналізу. На пачатку працы праведзена інвентарызацыя матэрыялу, а таксама класіфікацыя яго на аснове структурнага, семантычнага і лінгвагеаграфічнага аналізу. Падчас далейшага даследавання выкарыстаны апісальны, параўнальна-супастаўляльны, параўнальна-гістарычны, арэальны метады, элементы статыстычнага аналізу.

Асноўная частка. Прозвішчы на *-оў/-ёў/-еў/-аў* (*Зайцаў, Міхасёў, Лапцеў, Архіпаў*) і на *-ін/-ын* (*Васькін, Капейкін*) на Лёзненшчыне займаюць першае месца сярод другасных па прадуктыўнасці: ім належыць амаль 60%. Для параўнання: частотнасць такіх онімаў на тэрыторыі Глыбоцкага раёна ў чатыры разы меншая і складае ўсяго 15%.

На нашу думку, прычыну надзвычай высокай частотнасці прозвішчаў на *-оў/-ёў/-еў/-аў* і на *-ін/-ын* у Лёзненскім раёне трэба шукаць у гістарычных асаблівасцях фарміравання антрапанімікону гэтай тэрыторыі і ў яе геаграфічным становішчы: на ўсходзе Віцебская вобласць мяжуе з Расійскай Федэрацыяй, таму антрапанімныя традыцыі гэтай суседняй дзяржавы аказваюць значны ўплыў на якасны склад прозвішчаў усходняй Віцебшчыны.

Наогул жа адзінкі на *-оў/-еў/-аў*, як лічыў М.В. Бірыла, у беларускай прозвішчаўтваральнай сістэме стаяць некалькі асобна ад прозвішчаў, утвораных пры дапамозе іншых фармантаў. "Калі ж улічыць той факт, што ў народным асяроддзі імёны па бацьку не былі звычайным элементам у назве асобы, а карысталіся мянушкай (*Кирюха Косой*) ці формай прыналежнага прыметніка (*Кирюха Ваякин*), то зразумела, што гэта прозвішчы кніжнага ці дакладней канцылярскага паходжання" [1, 52].

Неабходна таксама памятаць, што пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай

некаторыя землі сучаснай усходняй Віцебшчыны былі ўз'яднаны з Расіяй, пасля чаго іх насельніцтва было аформлена прозвішчамі на *-оў/-ёў/-еў/-аў.* "У працэсе арганізацыі новай адміністрацыйнай структуры, пашырэння на беларускія гарады прынцыпаў рускага гарадскога самакіравання, упарадкавання памешчыцкага землекарыстання і прывядзення да прысягі ўсяго насельніцтва далучанай часткі Беларусі пры афармленні дакументаў большасць яго (насельніцтва) была аформлена прозвішчамі з суфіксамі *-ов/-ев*" [2, 41].

Вынікі нашых назіранняў выяўляюць факты, калі зараз, як і раней, многія жыхары тэрыторый, што мяжуюць з Расійскай Федэрацыяй, імкнуцца дасягнуць "рускага" гучання свайго прозвішча, далучыўшы да яго фармант *-оў/-ёў/-еў/-аў* і замацаваўшы такія змены ў афіцыйных дакументах. У выніку *Белавус* становіцца *Белавусавым*, *Бугай – Бугаёвым, Гарбаты – Гарбатавым, Хвосцік – Хвосцікавым* і г.д.

Што да іншых структурных груп прозвішчаў, то на тэрыторыі даследаванага раёна назіраецца нізкая частотнасць адзінак на *-скі/-цкі* (менш за 9%) тыпу *Вярхоўскі, Давыдоўскі, Жарскі, Карпоўскі,* на *-ец/-эц, -авец* (0,14%) тыпу *Быхавец, Латыгалец, Панізовец, Піліпянец* у параўнанні з тым жа Глыбоцкім раёнам, дзе доля названых антрапонімаў большая ў разы і складае амаль 22% і 0,6% адпаведна. Як вядома, традыцыя называць чалавека па месцы яго жыхарства (*Вярхоўскі* 'родам з Вярхоўя', *Быхавец* 'з Быхава'), выкарыстоўваючы пры гэтым фарманты *-скі/-цкі* і *-ец/-эц, -авец,* якраз і характэрна для заходніх тэрыторый Віцебшчыны і не ўласціва яе ўсходу.

Прозвішчы на *-іч/-ыч/-ыц, -овіч/-эвіч/-евіч/-авіч* (*Багдановіч, Малевіч, Радзевіч, Хоміч*) на Лёзненшчыне малапрадуктыўныя – крыху больш за 1% (на Глыбоччыне – 16%). Прычына, відаць, у блізкасці, а раней – агульнасці гэтых зямель з рускімі тэрыторыямі, на якіх працэнт такіх адзінак таксама невысокі, бо ў XVI – XVIII стст. маскоўскія князі, а пасля і цар надавалі саслоўнае адценне імёнам па бацьку на *-ович*, абмяжоўваючы іх ужыванне і дазваляючы карыстацца толькі выбраным асобам. Як адзначаў М.В. Бірыла, спасылаючыся на дадзеныя А.М. Селішчава, у Пскове, напрыклад, фарманты *-ович, -евич* ва ўсіх прозвішчах былі заменены на *-ов, -ев* [2, 37].

На тэрыторыі Лёзненскага раёна першасныя прозвішчы, якія не маюць у структуры прозвішчаўтваральных фармантаў, характарызуюцца невялікай прадуктыўнасцю: доля адзінак, аманімічных з апелятыўнымі назоўнікамі тыпу *Алейнік, Губар, Лапко, Ціхоня,* складае 1% ад усіх зафіксаваных на гэтай тэрыторыі, з апелятыўнымі прыметнікамі тыпу *Белы, Гладкі, Скаромны, Шчаслівы* – 0,8%, з мужчынскімі ўласнымі асабовымі імёнамі тыпу *Гардзей, Генюш, Кандрат, Пятрага* – 0,9%. Частотнасць такіх антрапонімаў на захадзе Віцебшчыны істотна большая, напрыклад, у Глыбоцкім раёне 12%, 1,6%, 2% адпаведна.

У рускай антрапаніміі першасныя прозвішчы сустракаюцца надзвычай рэдка. А.В. Супяранская і А.В. Суслава называюць такія адзінкі "нестандартнымі", бо "асноўная маса рускіх прозвішчаў мае тыповыя канцавыя марфемы" [3, 59], аднак першасныя прозвішчы маюць тую перавагу над стандартнымі, што іх асновы больш жыва і непасрэдна адлюстроўваюць этнаграфічны малюнак мінулага" [3, 71]. Блізкасць тэрыторыі Лёзненскага раёна і Расійскай Федэрацыі, уплыў рускіх антрапанімных традыцый – фактары, якія дапамагаюць растлумачыць нязначную долю першасных прозвішчаў у антрапаніміконе Лёзненшчыны.

Заключэнне. Такім чынам, асноўнымі фактарамі, якія аказваюць уплыў на прадуктыўнасць розных па структуры прозвішчаў у асобных рэгіёнах

Віцебшчыны, з'яўляюцца: 1) гістарычныя асаблівасці фарміравання тэрыторыі сучаснай Віцебшчыны; 2) геаграфічнае становішча вобласці, якая на ўсходзе і паўночным усходзе мяжуе з Расійскай Федэрацыяй, таму ў гэтых раёнах павялічваецца ўплыў рускіх антрапанімных традыцый; паўночна-заходняя ж і заходняя часткі адчуваюць уздзеянне прыбалтыйскіх рэспублік; 3) існуючыя на пэўных тэрыторыях антрапанімныя традыцыі.

1. Бірыла, М.В. Беларускія антрапанімічныя назвы ў іх адносінах да антрапанімічных назваў іншых славянскіх моў (рускай, украінскай, польскай) / М.В. Бірыла. – Мн.: Выд-ва Акадэміі навук БССР, 1963. – 58 с.
2. Бірыла, М.В. Тыпалогія і геаграфія славянскіх прозвішчаў. Даклады X Міжнароднага з'езда славістаў / М.В. Бірыла. – Мн.: Навука і тэхніка, 1988. – 63 с.
3. Суперанская, А.В. "Нестандартные" русские фамилии / А.В. Суперанская, А.В. Суслова // Ономастика и норма. – М.: Наука, 1976. – С. 59 – 71.

УРБАНОНИМИЯ МАЛЫХ ГОРОДСКИХ ПОСЕЛЕНИЙ ПОГРАНИЧНЫХ РАЙОНОВ ВИТЕБСКОЙ И СМОЛЕНСКОЙ ОБЛАСТЕЙ

А.Н. Соловьев
Смоленск, ФГОУ ВПО «СГСХА»

Этнические границы, особенно между народами, близкими по происхождению, не являются резкими, четко отделяющими один этнос от другого. Сближаются не только явления материальной культуры, но и духовной, например, языковая картина мира. В настоящее время урбанонимы прочно вошли в языковую картину мира современного человека, при этом они не только служат для ориентации в пространстве, но и выполняют другие функции, например, мемориальную, идеологическую.

В качестве объекта для наблюдений мы выбрали категорию малых городских поселений (населенных пунктов с численностью жителей менее 50000 человек). Помимо малых городов в эту категорию входяит и рабочие поселки. С ономастической точки зрения эти поселения не изучаются. Есть лишь некоторые региональные работы [1;4].

Целью исследования является определение общих и частных закономерностей в бытовании урбанонимов на территории смоленско-витебского пограничья. Данная территория охватывает 5 районов: Велижский, Руднянский, Краснинский в Смоленской области и Лиозненский и Дубровенский в Витебской области. Исторически российская часть региона тяготела к Витебску или Орше, а в XX веке была передана в административное подчинение Смоленску. Исключением является левобережная часть Краснинского района, вошедшая в состав России в 1654 году. От каждого из районов мы выбрали по одному поселению.

Источниками исследования послужили с российской стороны картотека, составленная по материалам официальных сайтов городов и проверенная с помощью опроса местных жителей-информантов. Списки белорусских урбанонимов взяты из публикации А.М. Мезенко "Віцебшчына ў назвах вуліц" [3].

Всего мы зафиксировали 472 урбанонима в 5 населенных пунктах: 258 российских и 214 белорусских.

К общим чертам урбанонимии малых городских поселений относятся сле-